**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь**
**народны камерны аркестр установы адукацыі**
**«Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Н.Ф. Сакалоўскага»**

Кожны з жыхароў і гасцей Гомеля хоць раз чуў выступленні гэтага вядомага калектыву. Нязменным кіраўніком аркестра з 1997 года і па цяперашні час з'яўляецца выкладчык каледжа Мазепін Аляксандр Андрэевіч.

За гады свайго існавання калектыў пад кіраўніцтвам Мазепіна А.А. дасягнуў значнага прафесійнага майстэрства, дзякуючы чаму канцэртныя выступленні аркестра становяцца ўсё больш сталымі і яркімі. Пра гэта гавораць поспехі, якіх дасягнуў калектыў на розных рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і фестывалях. Сведчаннем папулярнасці канцэртаў аркестра з'яўляюцца поўныя залы слухачоў. За сезон камерны аркестр дае ў сярэднім каля 25 канцэртаў. У рэпертуары калектыву больш за 300 твораў розных эпох, жанраў; ад музыкі барока да нашых дзён, нязменна запатрабаваная творчасць беларускіх кампазітараў. Асновай кожнага канцэртнага выступу з'яўляюцца творы класічнай музыкі, хоць аркестр выконвае і джазавыя п'есы.

Папулярнасць калектыву, выканальніцкае майстэрства зрабілі калектыў пастаянным удзельнікам усіх значных музычных, культурных мерапрыемстваў вобласці, горада. Пераважная большасць выпускнікоў папаўняюць прафесійныя калектывы Беларусі і замежжа.

У 2004 годзе аркестру прысвоена найменне «народны аматарскі калектыў».

У красавіку 2021 года калектыў пацвердзіў ганаровае званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».



